**Царква Іаана Прадцечы 1742г.**
**аграгарадок Вішнявец, вул.Нясвіжская, 38А**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “2”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 612Г000609).



Царква Іаана Прадцечы знаходзіцца ў аграгарадку Вішнявец, з’яўляецца помнікам уніяцкай архітэктуры, у якім фрагментарна захаваліся прыкметы стылістыкі віленскага барока. У 1742 г. былі сабраны сродкі на ўзвядзенне муравана святыні, якая, дзякуючы добраму фінансаванню, была ў гэтым жа годзе і скончана. Мураваны храм меў традыцыйны для уніяцкіх цэркваў таго часу барочны двухвежавы фасад, а інтэр'ер з чатырма масіўнымі слупамі і кароткім шырокім сярэднім нефам набліжаў яго да архітэктуры традыцыйнага праваслаўнага храма. На хоры вялі вузкія вінтавыя лесвічкі ў цыліндрычных шахтах – амаль як у замку. А пасля таго як яна стала праваслаўнай (ў 1839 г.) гэты старадаўні храм у вёсцы Вішнявец быў трохі перабудаваны (ў 1852 годзе), дзве высокія прастакутныя барочныя вежы па баках галоўнага фасада храма былі заменены на невялікія цыліндрычныя вежкі з купаламі, якія і захаваліся да нашага часу. У 1871 годзе вакол царкоўнай тэрыторыі была пабудавана муравана-каменная агароджа са званіцай. Гэтую браму, на жаль, разабралі з прычыны яе трухлявасці, а новую збудавалі.

З 2009 – 2015 гг. у храме праводзіліся рэстаўрацыйныя і рамонтныя работы.

На сённяшні дзень храм у аграгарадку Вішнявец цалкам адрэстаўраваны і знаходзіцца ў добрым стане.

**Касцёл св.Іосіфа пачатак XX стагоддзя**
**аграгарадок Рубяжэвічы, вул.Першамайская, 80**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “2”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 612Г000621).



Касцёл св. Іосіфа – помнік архітэктуры неаготыкі. Цікавая гісторыя будаўніцтва касцёла. Магчыма, гэтая старадаўняя славутасць раёна ніколі б не ўзвышалася на ўзгорку ў вёсцы Рубяжэвічы, калі б у адзін цудоўны дзень не нарадзіўся Антоній Тур. Мясцовы жыхар Антоній Тур тры разы ездзіў у Пецярбург з просьбай да цара пабудаваць новы касцёл, і нязменна атрымліваў адмову. На пяшчаны ўзгорак у вёсцы Рубяжэвічы ён прывёз велізарны камень, на якім напісаў фразу: «Тут будзе пабудаваны каталіцкі касцёл». За сваё даволі адважнае дзеянне Антоній Тур быў пакараны ссылкай у Сібір на 12 гадоў. Туды ён адбыў разам з сям'ёй. Але прабыў ён там усяго сем гадоў, а потым атрымаў амністыю. Вяртанне Антонія стала сапраўдным трыўмфам, так як у 1905 годзе цар усё - такі даў сваю згоду на будаўніцтва касцёла. У 1906 годзе быў закладзены першы камень у падмурак касцёла. Архітэктурны праект быў распрацаваны панам Пільх з Ломжы (Польшча). Штодня больш за сотню сялян з навакольных мясцін увіхалася на будоўлі, у дапамогу ім было дадзена 6 конных кранаў і 50 каменячосаў. Сродкі на будаўніцтва збіраліся з жыхароў бліжэйшых вёсак,

аднак, часам ахвяраванні прыходзілі і здалёк, грошы прыходзілі нават з Амерыкі. Шмат ахвяравала на касцёл сям’я Ленскіх з маёнтка.

Узвядзенне самога будынка храма сапраўды было скончана ў 1908 годзе, праз тры гады пасля атрымання дазволу. Затым аж да 1910 года вяліся работы па ўнутранай аддзелцы храма і добраўпарадкаванні тэрыторыі. Адмысловыя кавалі вырабілі металічныя крыжы, якія ўжо другі век узвышаюцца над храмам, што асвяцілі ў 1911 годзе.

Вакол касцёла знаходзіцца мураваная агароджа, створаная ў 1924 годзе. У 1928 годзе з Вільні ў храм быў прывезены орган, на пятнаццаць галасоў і 820 трубак, гучанне якога напаўняе душы вернікаў радасцю ў гадзіны набажэнства.

**Рэшткі комплексу былой сядзібы: сядзіба, парк, вадаём першая палова XIX стагоддзя, сядзібны дом – каля 1830г. в. Вялікі Двор, “сядзібны дом” – в. Вялікі Двор, вул. Дземідовіча, 45**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14”мая 2007г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 612Г000610).









Паводле пісьмовых крыніц і картаграфічных матэрыялаў 19 ст., у мінулым сядзіба называлася Гарадзей. Маёнтак вядомы з 16 ст. як уладанне князей Радзівілаў. Кароль Радзівіл Пане Каханку прадаў маёнтак Мітарноўскім. Яны ў сваю чаргу ў 1818 г. прадалі Антонію Брахоцкаму.

Пачынальнікам роду Брахоцкіх герба Праўдзіц быў Сямён Мартынавіч (нарадзіўся ў 1653 г.), які валодаў маёнткам Брахоцінск у Плоцкім павеце Мазавецкім ваяводстве. На беларускія землі перасяліліся

чатыры браты: Антоній, Рох, Валенцій і Ігнацій. Тут яны купілі маёнткі і ажаніўшыся аселі на пастаяннае жыхарства. Іх сыны былі выхаваны ў традыцыях патрыятызму, прымалі актыўны ўдзел у напалеонаўскіх войнах і абодвух паўстаннях. Асабліва вызначыліся сын Валенція, таксама Валенцій (1782 – 1856), паўстанец 1831 г. і эмігрант, Уладзіслаў (1810 – 1890), сын Роха і Александры з роду Алендзкіх, дастойны грамадзянін, удзельнік паўстання 1863 г., сасланы ў Перм, Антоній, маршалак Ашмянскага павета, таксама удзельнік паўстання 1863 г., сасланы ў ссылку. Сынам Роха быў палкоўнік Адам Юзаф Брахоцкі (1796 – 1858), жанаты з Мілашэўскай, адзін з уладальнікаў Гарадзея.

Брахоцкія валодалі маёнткамі: Гарадзей, Уша, Вераскова, Морынь, Нянькоў, Малое Мажэйкава. Вышэй ужо адзначана, што сыну Валенція Антонію (нарадзіўся ў 1759 г.) па купчай, афармленай ў Навагрудскім павятовым судзе, адышоў у 1818 г. Гарадзей ад Мітарноўскіх. Антоній валодаў таксама маёнткам Уша. У 1826 г. па дароўным запісу ад Антонія Уша і, верагодна, Гарадзей перайшлі Адаму Юзафу Брахоцкаму (1796 – 1858 гг.), які меў званне палкоўніка. Менавіта Адам Брахоцкі ў першай палове 19 ст. пабудаваў сядзібу ў стылі позняга класіцызму.

Пасля смерці Адама Брахоцкага ў 1858 г. маёнтак дастаўся яго дачцэ Эміліі, якая не была замужам, таму пасля яе смерці Гарадзей дастаўся другой дачцэ Адама Брахоцкага Марыі. У 1876 г. ў маёнтку лічылася 1353 дзесяціны зямлі, 3 карчмы, ветраны і вадзяны млыны.

У 1890 г. сядзібу набыў князь Міхал Святаполк-Мірскі, уладальнік Міра. Сядзібай ён асоба не апекаваўся, амаль там не жыў, яго цікавіў больш даход з маёнтка. У 1914 г. ў сядзібным доме размяшчаўся шпіталь. У Першую сусветную, затым у савецка-польскую вайну сядзіба была разрабавана.

Пасля 1921 г. Святаполк-Мірскія вярнуліся ў свае ўладанні, але больш засяродзіліся на Міры, пакінуўшы Гарадзей у закінутым стане. У пачатку 1930-х гадоў сядзібу канфіскавалі за даўгі ў казну. У адрамантаваным будынку сядзібнага дома ў 1934 г. пачала працаваць школа.

Сядзібны дом датуецца 1830 годам. Будынак быў прамавугольны ў плане, цэнтральны аб’ём на шырыню трох аконных праёмаў двухпавярховы, бакавыя крылы – аднапавярховыя, пры гэтым пад усім домам меўся цокальны паверх. З боку паркавага фасада па цэнтры на ўзроўні першага паверха існавала шырокая адкрытая тэраса, да якой вёў высокі ступеньчаты ганак на аркадах. Летам на ганку выстаўляліся экзатычныя расліны ў кадках. Такая архітэктурна-аб’ёмная кампазіцыя была даволі распаўсюджанай сярод сядзібных дамоў і палацаў эпохі класіцызму. Галоўны, з боку пад’язной алеі, і паркавы фасады рашаліся аднолькава.

Адрозненне заключалася толькі ў наяўнасці на паркавым фасадзе тэрасы, на галоўным – невялікага балкона на кранштэйнах на другім паверсе. У аздабленні фасадаў былі выкарыстаны аконныя абрамленні, прамыя і трохвугольныя сандрыкі, цягі, вуглавыя пілястры, фрыз з трыгліфамі, карніз з сухарыкамі. Уваходныя дзверы былі двухстворкавыя дубовыя, размешчаныя ў цокальным паверсе. Таўшчыня сцен сядзібнага дома раўнялася каля 60 см. Дах быў пакрыты бляхай, над цэнтральнай часткай двухсхільны, на крылах вальмавы (трохсхільны).

Цокальны паверх, які ішоў па цэнтры праз увесь будынак, быў падзелены на дзве функцыянальныя часткі. У тарцовых паўднёва-ўсходняй і паўночна-заходняй сценах існавалі асобныя гаспадарчыя ўваходы. Па цэнтры з боку галоўнага ўвахода знаходзіўся на вышыні двух паверхаў хол. З трох бакоў яго атачала лесвіца, выкананая з масіву дуба. На ніжнім паверсе хол служыў сенямі, альбо пярэднім пакоем. Вялікае памяшканне з паўднёва-заходняга боку, якое па памерах адпавядала холу і прымыкала да яго, прадназначалася для захавання гародніны. Невялікае памяшканне ва ўсходнім куце будынка, у якім былі два закратаваных акна, з’яўлялася скарбніцай. Але ў ім не трымалі каштоўныя рэчы, а захоўвалі бакалейныя тавары. У астатніх памяшканнях жыла прыслуга пры сядзібе, некаторыя выкарыстоўваліся як складскія. Пад сутарэннем знаходзілася яшчэ піўніца, а пад ёй канал сцёкавы, па якім нечыстоты сцякалі да бліжэйшай ракі. Планіроўка першага паверха была анфіладнай, без калідора. З боку галоўнага фасада быў хол, насупраць, з боку паркавага фасада – салон з выхадам на тэрасу праз трое зашклёных дзвярэй, якія, як і вокны, былі падзелены пераплётамі на 8 частак. У паўднёва–ўсходнім крыле дома былі чатыры амаль квадратныя ў плане памяшканні. Адно з іх, што прымыкала да салона, магло быць сталовай, а наступнае за ім буфетнай. На гэта ўказвае бакавая лесвіца, якая злучала гэтыя пакоі непасрэдна з цокальным паверхам. У паўночна-заходнім крыле з боку галоўнага фасада былі такія ж два блізкія да квадратных памяшканні, з боку паркавага фасада да салона прымыкаў кабінет з бібліятэкай (вялікі пакой на тры акна) і ў тарцы крыла размяшчаліся дзве невялікія спальні. На другім паверсе быў хол і жылы пакой, па некаторых звестках, любімы пакой Эміліі Брахоцкай.

Інтэр’еры сядзібнага дома былі афармлены параўнальна сціпла. У пакоях была паркетная дубовая падлога. Паркетныя дошчачкі памерам 15х30 см укладваліся парамі пад прамым вуглом. Абаграваліся пакоі кафлянымі печамі. У міжваенны перыяд іх замянілі на звычайныя печы. У кабінеце і Адама Брахоцкага, і пакоі Эміліі існавалі каміны, змураваныя з цэглы і патынкаваныя. Мелі яны сціплы класічны выгляд. Верхні гарызантальны карніз каміна ў адным падтрымлівалі па баках дзве

валютападобныя кансолі, у другім – канеліраваныя вушакі. Унутраная частка каміна была закрыта каванай бронзавай рашоткай (не захавалася).

Перад домам быў газон з кветнікам, абсаджаны нізкімі дрэвамі і кустамі. Вакол сядзібнага дома існаваў парк плошчай 10-15 га, абмежаваны з паўночна-заходняга і заходняга боку ставам, з усходняга – алеяй ліпавай. Парк меў штыкетную агароджу паміж мураванымі слупкамі. У асноўным раслі ліпы, дубы, лістоўніцы, каштаны, ясені, таполі, бярозы. Былі пасаджаны групамі і адзіночнымі дрэвамі. Побач з сядзібным домам, справа стаяў флігель альбо павільён. Паблізу знаходзілася аранжарэя. Аранжарэю са стайняй для выязных коней, а флігель са свірнам злучала высокая мураваная сцяна (каля 2 м вышыні). Маляўнічасць парку ўзмацнялі тры ставы: невялікі авальны штучны, побач нерэгулярны выцягнутай формы натуральны, званы “старым возерам”, і трэці самы вялікі, штучна выкапаны, званы “новым возерам”. Пры сядзібе дзейнічаў крухмальны завод, млын, сыраварня, існаваў гаспадарчы двор. Ад паштовага тракта да сядзібы вяла доўгая бярозавая алея. На ўездзе ў сядзібу стаяла брама. За сядзібай у паўднёва-ўсходнім напрамку, пры дарозе Брахоцкія пабудавалі капліцу-пахавальню. Да 1939 г. ад яе засталіся толькі падмуркі.

У час Вялікай Айчыннай вайны сядзібны дом захаваўся, частка гаспадарчых пабудоў была разбурана.

Пасля вайны ў сядзібным доме па-ранейшаму размясцілася школа. Сядзібны дом быў дабудаваны з бакоў, прыбудаваны ўваходны тамбур (канец 1950-х-1960-я гг.). На паркавым фасадзе страчаны тэраса з лесвіцай, замураваныя да ўзроўню аконных, дзвярныя праёмы выхадаў на тэрасу (сярэдні праём цалкам замураваны). Каля фасада ўзведзены металічны комін кацельні. На галоўным фасадзе захаваўся балкон з літай агароджай.

Унутраная планіроўка сядзібнага дома часткова зменена. У цокальным паверсе захаваліся скляпеністыя перакрыцці былой скарбніцы. Захаваліся часткова два каміны, філянговыя дзверы, уваходныя дзверы разам са скабянымі вырабамі (ручкай і замком). Паркетная падлога не захавалася. Драўляная лесвіца, хутчэй за ўсё, была перароблена ў міжваенны перыяд, альбо адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны.

Парк быў закладзены ў 30-е гады XIX стагоддзя, як частка сядзібы Брахоцкіх “Гарадзей”. Брахоцкія сістэматызавалі парк у англійскім стылі, былі пасаджаны: еўрапейская лістоўніца, белая таполя і другія не характэрныя для нашай паласы дрэвы. Вакол сядзібнага дома існаваў парк плошчай 10-15 га, абмежаваны з паўночна-заходняга і заходняга боку ставам, з усходняга – алеяй ліпавай. Парк меў штыкетную агароджу паміж мураванымі слупкамі.

Маляўнічасць парку ўзмацнялі тры ставы: невялікі авальны штучны, побач нерэгулярны выцягнутай формы натуральны, названы “старым возерам”, і трэці самы вялікі, штучна выкапаны, названы “новым возерам”. Сюды запускалі злоўленную ў іншым месцы рыбу, і тут яе можна было пры патрэбе лёгка адлавіць зноў. Да нашага часу захавалася толькі адно, названае “новым возерам. ”. Дно «новага возера» было засыпана чыстым пяском, які здабываўся ў мясцовым кар'еры. У пачатку 1930-х гадоў сядзібу канфіскавалі за даўгі ў казну.

У адрамантаваным будынку сядзібнага дома ў 1934 г. пачала працаваць школа. Навучальная ўстанова працягнула сваю працу і пасля Вялікай Айчыннай вайны, за парты старажытнага панскага маёнтка села першае пасляваеннае пакаленне дзяцей.

Сядзібны дом быў дабудаваны з бакоў, прыбудаваны ўваходны тамбур (канец 1950-х – 1960-я гг.).

Унутраная планіроўка былога сядзібнага дома крыху зменена ў сувязі з іншым функцыянальным выкарыстаннем, аднак анфіладная структура ў цэлым захавана, захаваны хол на вышыню двух паверхаў. Былыя фасадныя сцены, якія ў выніку пазнейшых прыбудоў апынуліся ўнутры будынка, захавалі сляды замураваных праёмаў і элементаў дэкору (ліштвы, сандрыкі). У цокальным паверсе захаваны скляпенні ў былой скарбніцы, адна гранёная калона, відаць, раней афармляла вестыбюль. Захаваны ранейшыя дзвярныя праёмы і філянговыя дзверы, асобныя дзверы маюць страты філёнгаў, маюцца рэшткі двух камінаў (знешняе аблічча). Драўляная лесвіца, магчыма, мае пазнейшыя пераробкі, але па размяшчэнні ў інтэр’еры адпавядае гістарычнай.

Будынак сядзібнага дома (яго гістарычнай часткі) вызначае строгая сіметрыя, кампактнасць, прапарцыянальнасць формаў.

У 2010 годзе ў сядзібным доме былі праведзены рамонтныя работы: рамонт даху, замена аконных запаўненняў.

У сярэдзіне 2023 года праведзены бягучы рамонт будынка школы (сядзібны дом).

**Касцёл 1598г., пачатак XVIIст.**
**аграгарадок Дзераўная, вул.Ваньковіча, 17А**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14”мая 2007г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “2”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 612Г000611)



Касцёл у аграгарадку Дзераўная знаходзіцца ў цэнтры вёскі, на невялікай узвышанасці. Касцёл – помнік архітэктуры готыкі і рэнесансу. Існуючы касцёл пабудаваны ў 1598 г. па фундацыі Радзівіла Сіроткі і яго жонкі Яўфіміі з Вішнявецкіх.

Храм аднавежавы прамавугольны ў плане з пяціграннай паніжанай алтарнай часткай і прыбудаванымі да яе з бакоў прамавугольнымі сакрысціямі. Галоўны фасад вылучаны трох'яруснай вежай шатровым пакрыццём. Ніжні ярус чатырохгранны. Вуглы вежы ў ніжняй частцы ўмацаваны контрфорсамі. Верхнія ярусы чатырохгранны і васьмігранны. Грані апрацаваны плоскімі арачнымі нішамі. Алтарная апсіда мае архаічныя гранёныя формы, але адначасова новую незвычайную форму даху, які зроблены больш нізкім толькі над трохгранным завяршэннем. Пры гэтым вялікая віма прэсбітэрыя і размешчаныя абапал сакрысціі аб’яднаны з нефам агульным дахам з падоўжным вільчыкам. Часткі сакрысцій выступаюць за межы нефа і маюць самастойныя двухсхільныя дахі. Сцены асноўнага аб’ёму ўмацаваны контрфорсамі. Разам з нішамі яны ўзмацняюць пластычную выразнасць помніка. Вокны паўцыркульныя, размешчаны ў

верхняй частцы сцен. У заходняй сакрысціі зроблены прамавугольныя аконны і дзвярны праёмы, ва ўсходняй – два невялікія акенцы, размешчаныя ў два ярусы. Асноўны аб’ём храма накрыты двухсхільным дахам.

Будынак аднанефавы, перакрыты цыліндрычным скляпеннем на падпружных арках з распалубкамі над аконнымі праёмамі. Сістэма апор і падпружных арак падзяляе неф на 4 травеі. Алтарная частка адкрываецца ў асноўнае памяшканне вялікім арачным праёмам. Нартэкс і сакрысціі перакрыты крыжовымі скляпеннямі. У асноўным памяшканні над уваходам драўляныя хоры, якія падтрымліваюцца чатырма калонамі. На хоры вядуць дзве бакавыя лесвіцы, размешчаныя ў тоўшчы заходняй і ўсходняй сцен. Пад вокнамі – плоскія арачныя нішы. Дэкаратэўна мастацкае афармленне інтэр’ера ўключае 3 алтары барочнай стылёвай трактоўкі, класіцыстычны амбон, арнаментальны роспіс скляпенняў.

Тэрыторыя вакол касцёла абнесена бутавай агароджай з украпінамі маленькіх чорных каменьчыкаў (так званая разынкавая муроўка). На восі галоўнага фасада касцёла ў агароджы зроблена двухпралётная брама (з адной форткай з усходняга боку). Асноўны пралёт брамы фланкіраваны пілонамі, завершаны трохвугольным франтонам.

У касцёле знаходзіцца арган Вайсенборна, арганнага майстра з Якабштата (Латвія). Ф. Вайссэнборн быў адным з самых вядомых арганабудаўнікоў на тэрыторыі сучаснай Латвіі ў другой палове XIX стагоддзя. Арганы Фрыдрыха Вайсенборна вылучаюцца высокай якасцю, яркім і гучным гукам. На дзвярах арганнай шафы захаваўся аўтограф Фрыдрыха Вайсенборна з пазначэннем года – “1900”, адкуль і вынікае дата пабудовы інструмента. Праспект аргана з дэкаратыўных труб выкананы характэрным для Ф.Вайсенборна стылі. Арган захаваўся амаль цалкам у аўтэнтычным стане (за выключэннем адзінкавых труб).

Касцёл у аг.Дзераўная знаходзіцца ў добрым стане.

**Касцёл Успення Дзевы Марыі пачатак XX стагоддзя**
**аграгарадок Налібакі, вуліца Азёрная, 27**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14”мая 2007г. № 578 “Аб статусе гісторыка -культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 612Г000618).



Асноўнай славутасцю вёскі Налібакі з'яўляецца касцёл Успення Дзевы Марыі. Паводле пісьмовых крыніц, касцёл у Налібаках ужо існаваў у 15 ст. У 1636 г. Альбрэхт Станіслаў Радзівіл пабудаваў драўляны касцёл, які згарэў падчас вайны. У 1699 г. Радзівілы пабудавалі новы касцёл, асвечаны ў 1704 г. віленскім біскупам Канстанцінам Казімірам Бжастоўскім. У 1935 г. ксёндз Юзэф Бойка распачаў будаўніцтва новага касцёла з цэглы. Быў запрошаны біскуп Казімір Букраба, каб закласці першы камень у алтарную сцяну. Калі распачалася вайна, былі ўзведзеныя толькі сцены новага касцёла. 1943 год для Налібакаў стаў трагічным: немцы расстралялі ў Налібоцкай пушчы любімага пробашча кс. Юзафа Байку і вікарыя кс. Юзафа Барадына, а стары драўляны касцёл, як і іншыя драўляныя пабудовы, быў

знішчаны агнём. Агонь пашкодзіў і новы касцёл, які прастаяў у такім стане аж да 90-х гадоў. Будаўніцтва працягвалася да 1941 г. Завершана будаўніцтва ў 1989 – 1994 гг.

Мураваны трохнефны бязвежавы храм. Цэнтральны неф вышэйшы за бакавыя, накрыты двухсхільным дахам, бакавыя – аднасхільнымі дахамі. У плане мае выцягнуты прамавугольнік з двума бакавымі капліцамі. Касцёл пастаўлены на высокі бутавы цокаль. Фасады абліцаваны чырвонай цэглай, пластыка стрыманая: фасадныя плоскасці крапаваны спаранымі плоскімі лапаткамі, прарэзаны арачнымі аконнымі праёмамі, размешчанымі ў два ярусы, завершаны карнізам. Галоўны і тыльны фасады завершаны фігурнымі неабарочнымі франтонамі.

На галоўным фасадзе ў франтоне размешчана круглае акно, на тыльным – паўцыркульнае. Лучковы дзвярны праём галоўнага ўвахода аформлены нескладаным парталам, вымураваным з лякальнай цэглы, дзверы двухстворкавыя філянговыя. Над уваходам паўцыркульнае акно. Адна капліца прымыкае да нартэкса з паўночна-ўсходняга боку, другая да прэсбітэрыя з паўднёва-заходняга боку. Капліцы прамавугольныя ў плане, накрыты вальмавымі дахамі, грані чляняны арачнымі аконнымі праёмамі і нішамі. У капліцы, што прымыкае да прэсбітэрыя, вокны аднолькавыя з вокнамі на фасадах касцёла, у капліцы, што прымыкае да нартэкса, вокны выцягнутыя па вышыні. На паўночна-ўсходняй грані капліцы існуе балкон. У цокалі капліцы, што прымыкае да прэсбітэрыя, з паўднёва-заходняга боку зроблены дзвярны праём.

Апсіда прамавугольная ў плане, крыху вузейшая за асноўны аб’ём касцёла, накрыта пакатым вальмавым дахам. Фасады карнізам падзелена на два ярусы. Верхні ярус значна меншы, прарэзаны круглымі вокнамі (па два акны на бакавых і тры акны на тыльным фасадах), завершаны карнізам. У ніжнім ярусе апсіды вокны размешчаны ў два рады. На паўночна-ўсходнім фасадзе апсіды ў ніжнім радзе змешчаны арачны дзвярны праём – у верхнім два арачных высокіх акны; на тыльным фасадзе ў ніжнім ярусе – тры лучковыя аконныя праёмы, з іх сярэдні шырэйшы, у верхнім радзе – тры арачныя аконныя праёмы, вышэйшыя за вокны ніжняга рада, сярэдні праём таксама шырокі; на паўднёва-заходнім фасадзе – знізу два лучковых акны (адно замуравана), зверху два вышэйшых арачных акны.

У касцёле пяць вялікіх і столькі ж меншых алтароў. Упрыгожваюць касцёл вітражы, выкананыя ў класічнай тэхніцы з размалёўкай на тэмы "Распяцце" і "Уваскрасенне Хрыста".

Тэрыторыя вакол касцёла абнесена бутавай агароджай. У агароджы зроблена двухпралётная брама (з адной форткай з паўночнага боку).

Асноўны пралёт брамы і форткі фланкіраваны пілонамі, завершаны трохвугольнымі франтонамі.

Дадзены храм мае вельмі вялікія памеры. Тэрыторыя вакол касцёла ў вёсцы Налібакі добраўпарадкавана. Тут, акрамя храма, маецца таксама: драўляная капліца, невялікая сучасная металічная званіца; некалькі скульптур.

Касцёл Успення Дзевы Марыі знаходзіцца ў добрым стане.

**Мемарыяльны комплекс “Дзяржынава”канец XIX стагоддзя хутар Дзяржынава**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14”мая 2007г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000612) .







У 70-х гг. XIX ст. сядзіба дробнапамеснага збяднеўшага шляхетнага роду Дзяржынскіх – маёнтак Аземблова-Дзяржынава належала Ашмянскаму павету Віленскай губерні (цяпер Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці). Тут, у маёнтку, і нарадзіўся ў 1877 годзе Ф.Э. Дзяржынскі, савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч. Яго дзіцячыя гады прайшлі ў Дзяржынаве ў драўляным доме з мансардай, пабудаваным ў 1880 годзе. Ф.Э.Дзяржынскі пражыў ў Дзяржынава да 1887г., калі ён паступіў у першую віленскую гімназію.

Род Дзяржынскіх мае беларускія карані, што падцвярджаюць радавыя гербы “Суліма” і “Ястрабец”. Аднак з цягам часу, як і большасць родаў беларускай шляхты, якія прытрымліваліся каталіцкага веравызнання, Дзяржынскія паланізаваліся. Гэта было характэрнай з’явай таго часу ў асяроддзі мелкапамесных землеуладальнікаў.

Маёнтак “Дзяржынава” быў невялікім – 92 дзесяціны пяшчанай зямлі, якая здавалася ў арэнду за сімвалічную плату – 42 рублі ў год. На гэтыя сродкі і на невялікую пенсію бацькі і жыла сям’я Дзяржынскіх. У 1935 годзе ў Дзяржынаве пасяліўся са сваёй жонкай старэйшы брат Ф.Э. Дзяржынскага – Казімір Дзяржынскі. У гады Вялікай Айчыннай вайны яны актыўна ўдзельнічалі ў партызанскім руху на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці. За сувязь з партызанамі ў ліпені 1943 года Казімір і Люцыя Вільгельмаўна Дзяржынскія былі расстраляны акупантамі.

Сядзіба “Дзяржынава” была спалена ў ліку 150 вёсак Валожынскага, Івянецкага, Любчанскага, Навагруцкага і Юрацішкаўскага раёнаў нямецкімі акупантамі ў час правядзення карніцкай аперацыі пад кодавай назвай “Герман” супраць партызан Баранавічскага злучэння, якое дыслацыравалася ў Налібоцкай пушчы ў чэрвені – жніўні 1943 года.

У 1963 годзе па рашэнні Савета Міністраў БССР сядзіба “Дзяржынава” з прылягаючай тэрыторыяй у 80 га была абвешчана помнікам прыроды рэспубліканскага значэння.

У 1972 годзе ў Дзяржынаве быў адкрыты мемарыяльны комплекс, які стаў філіялам Івянецкага музея Ф.Э. Дзяржынскага.

У 2004 годзе быў завершаны першы этап аднаўлення сядзібы і жылога дома канца XIX ст. Была добраўпарадкавана тэрыторыя (4,08 га), праложаны тратуарныя дарожкі, тэрыторыя сядзібы агароджана драўляным плотам. Былі прыведзены ў парадак разбураныя часам фундаменты гаспадарчых пабудоў, поўнасцю адноўлены ў адпаведнасці з гістарычнымі дакументамі жылы дом з мансардай, дзе прайшло дзяцінства Ф.Э. Дзяржынскага. Новы сядзібны дом быў адноўлены на аўтэнтычным месцы па гістарычным фотаздымкам.

Мемарыяльны комплекс “Дзяржынава” у 2002 годзе быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Адчыніўся Мемарыяльны комплекс “Дзяржынава” 7 кастрычніка 2004 года. Створаная ў Доме–музеі экспазіцыя атрымала высокую ацэнку Прэзідэнта і асоб дэлегацый-удзельніц 17-га паседжання Савета кіраўнікоў органаў бяспекі і спецыяльных службаў дзяржаў-удзельніц СНД, кіраўніцтва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

## Помнік Ф.Э. Дзяржынскаму 1977г.,
## хутар Дзяржынава

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14”мая 2007г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “2", унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 612Ж000613).



Помнік Ф.Э. Дзяржынскаму быў пабудаваны ў 1977 годзе.

У цэнтры мемарыяла, на высокім прамавугольным пастаменце з чырвонага граніту бронзавы бюст Ф.Э.Дзяржынскага (скульптар С.Вакар, архітэктар Ю.Казакоў). Пастамент з чырвонага граніта, бюст з бронзы. Да яго вядзе выкладзеная цэментнымі плітамі дарожка, з левага боку якой размешчаны 49 камянёў. Яны сімвалізуюць 49 гадоў, пражытых палымяным рэвалюцыянерам. Ад самага вялікага каменя сцяжынка вядзе да месца, дзе некалі стаяў дом Дзяржынскіх, спалены ў 43 годзе нямецка-фашысцкімі акупантамі. Скульптар Вакар С.М. зрабіў выяву Ф.Э. Дзяржынскага згодна з агульнапрынятай традыцыяй. Ф.Э.Дзяржынскі прадстае ў выглядзе “Жалезнага Фелікса”, так як ён выглядаў у першыя гады рэвалюцыі ў час стварэння ВЧК. Строгі, харызматычны, крыху напружаны твар, сур’ёзны позірк.

**Рэшткі былой сядзібы: фрагменты парку, вадаём, капліца, гаспадарчая пабудова, гаспадарчая пабудова, афіцына, лядоўня Мінская вобл., Стаўбцоўскі р-н, “фрагменты парка, вадаём” – в.Сула, “капліца” – в.Сула, вул.Цэнтральная, 14 (інв. № 622/С-45919), “гаспадарчая пабудова” – д.Сула, вул.Цэнтральная, 14 (інв. № 622/С-11713), “гаспадарчая пабудова” – в.Сула, вул.Цэнтральная, 14 (інв. № 622/С-11719), “афіцына” - в.Сула, вул.Цэнтральная, 14 (інв. №622/С-11727), лядоўня” – в.Сула, вул.Цэнтральная, 14 (ліцер А1/бут)**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14”мая 2007г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Г000625).



Землі Сулы ў XVI ст. адносіліся да каралеўскіх. С. Баторый падараваў іх Міхаілу Байбузе. У1590 г. Сула перайшла да князя А.Вішнявецкага, затым – да Радзівілаў. 3 канца XVIII ст. маёнтак стаў уласнасцю Паўла Ленскага. Невялікая частка маёнтка, мяркуючы па адной з купчых ад Ленскіх перайшла і да Калантая, а ў 1850 г. яе купілі Ратынскія. Сядзіба ўключала сядзібны дом, пейзажны парк з вялікім штучным вадаёмам, капліцу-пахавальню, млын на ручаі, спіртзавод, лядоўню, сад, аранжарэю, агарод, дашчатую вяндлярню, і гаспадарчы двор. Сядзіба пачала фарміравацца ў пачатку 19 ст. Тады быў пабудаваны драўляны

аднапавярховы сядзібны дом у стылі класіцызму. Ён з’яўляўся цэнтрам усёй кампазіцыі. У плане будынак быў прамавугольны, накрыты гонтавым вальмавым дахам. Галоўны фасад быў вылучаны дарычным чатырохкалонным порцікам, завершаны трохвугольным франтонам з паўкруглай люкарнай у тымпане. Падобны порцік з тэрасай і каменным ганкам размяшчаўся з боку паркавага фасада. Яшчэ два двухкалонныя порцікі меліся на бакавых фасадах дома. Будынак не захаваўся, быў знішчаны ў 1939 г. Вакол дома на плошчы 5 га быў заснаваны парк у англійскім стылі. Перад сядзібным домам існаваў парадны партэр у форме квадрата з вялікім кругам у цэнтры. Партэр па баках быў абсаджаны дрэвамі явара, клёна востралістага, бярозы і дэкаратыўнымі кустамі. Спуск ад параднага двара па адносна высокай тэрасе да р.Сулы, на якой быў створаны стаў, уяўляў сабой газон. Вакол дома на газонераслі лістоўніцы. Як адзначае А.Т.Федарук, адкрытасць забяспечвала маляўнічасць далёкіх перспектыў і візуальна пашырала прастору парку. За сядзібным домам, па звестках вучонага, знаходзіўся агарод і стаяла аранжарэя ў акружэнні ягадных кустоў (цяпер на гэтым месцы прыватная сядзіба). У глыбіні парку, на паўночны ўсход ад сядзібнага дома, была пабудавана капліца-пахавальня ў форме ратонды, афармленая калонамі тасканскага ордэра. З галоўнага фасада капліца падобна на паркавую альтанку, з паўночнага фасада мае невялікую алтарную частку. Дакладная дата будаўніцтва капліцы не выяўлена. Хутчэй за ўсё была пабудавана ў другой палове 19 ст. Найбольш верагодна ў 1870-я гг. Аляксандрам Антонавічам Ленскім. Да капліцы ад бакавога фасада дома праз газон вяла дарожка. Непасрэдна ў капліцу вяла каменная лесвіца. Вакол капліцы пахавальні раслі адзінкавыя хвоі, бярозы, вязы. За ратондай парк пераходзіў у дрэўны масіў, які абмяжоўваў сядзібу з усходу. Паміж домам і капліцай-пахавальняй, на думку А.Т.Федарука, існаваў невялікі стаў. Акрамя капліцы, у парку, на невялікай адлегласці ад сядзібнага дома, знаходзілася мураваная з камянёў лядоўня. Гаспадарчы двор займаў заходнюю і паўднёва-заходнюю частку сядзібы. Па звестках А.Т. Федарука, тут знаходзіліся свіран, вазоўня, стайня для рабочых коней, кузня са стэльмашняй, гумно, сыраварня, кароўнік, жылы флігель і г.д. Пасярод двара існаваў калодзеж. Захаваліся мураваныя будынкі кароўніка, кузні са стэльмашняй і дом батракоў. Каля ракі, з заходняга боку ад уязной алеі, знаходзіліся бровар (захаваліся руіны) і млын (згарэў у 1992 г.).

У архіўных дакументах адсутнічаюць звесткі аб часе будаўніцтва гаспадарчых пабудоў. Улічваючы будаўнічую тэхніку, у якой выкананы ацалелыя гаспадарчыя пабудовы, іх можна датаваць канцом 19 – пачаткам 20 ст. Уязная алея ў сядзібу шырынёй 10 м вяла з паўднёвага боку,

пачыналася ад тракта Рубяжэвічы – Волма. Паводле Федарука, алея перасякала ўзгорыстую жывапісную мясцовасць, потым, разрэзаўшы марэнны ўзгорак, пераходзіла ў насыпную грэблю ў паніжанай пойменнай частцы сядзібы. Сярод поля алею ўтвараў клён востралісты, дрэвы былі пасаджаны ў радзе праз 8 м. У паніжэнні былі выкарыстаны вольха чорная і вярба ломкая, а на ўчастку перад парадным дваром – елка і клён. Уезд на парадны двор фіксавала брама з агароджай, да якой прымыкала стайня выязных коней і вазоўня (не захаваліся). Да нашага часу сядзіба захавалася фрагментарна: нязначныя фрагменты парку, вадаём на рацэ, капліца-пахавальня, лядоўня, будынак кароўніка, афіцына, кузня са стэльмашняй (адноўленыя). У значнай ступені страчана планіроўка сядзібы, ад уязной алеі захаваўся невялікі фрагмент ад тракта Рубяжэвічы – Волма да р. Сулы. Значная частка тэрыторыі былой сядзібы выкарыстоўваецца як парк-музей інтэрактыўнай гісторыі “Сула”, будынкі і збудаванні ўключаны ў сучасны комплекс як асобныя аб’екты музейнага і ўтылітарнага прызначэння. Былая сядзіба як адзіны комплекс для пражывання і гаспадаркі для забеспячэння патрэб асобнай сям’і страціла сваю каштоўнасць у выніку знішчэння першапачатковай функцыі, разбурэння шматлікіх будынкаў, а таксама частковай забудовы тэрыторыі парка і былой гаспадарчай зон

У сувязі з гэтым захаваныя асобныя будынкі і збудаванні набываюць ролю гістарычных сведкаў аднаго з этапаў развіцця тэрыторыі, музейную каштоўнасць і мастацкую вартасць, што вельмі добра прэзентуюцца ў сучасным асяроддзі з новымі.

**Былы вадзяны млын**
**в.Новы Свержань, вул.Нясвіжская, 23А**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “12” верасня 2011г. № 1214 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей" помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Г000445).



Былы вадзяны млын уяўляе сабой прамавугольную ў плане пабудову з ваконнымі і дзвярнымі праёмамі без дэкаратыўнага аздаблення і тынкавання. Ніжняя частка складзена з валуноў з дамешкамі дробных камянёў на цэментна-вапнавай рошчыне. У ёй з боку ракі захаваліся адтуліны пад механізмы. Верхняя частка аддзелена ад бутавай маналітным жалезабетонным поясам і складзена з цэглы з ваконнымі праёмамі, завяршаецца двухсхільным дахам з франтонамі на тарцах. Тэрыторыя вакол будынка млына маляўніча добраўпарадкавана з руслам ракі, для якой уладкаваны падыход.

Вадзяны млын пабудаваны ў сярэдзіне XIXст. на адным з рукавоў ракі Жацераўка пры выездзе з гістарычнай часткі вёскі на Нясвіж. Гэта адзіны будынак млына, які захаваўся ў весцы Новы Свержань.

Пра млын сярод жыхароў вёскі хадзілі чуткі, што ён з'яўляецца прыстанішчам усякага роду злых духаў і міфічных істот: вадзяных, русалак і іншага.

Вадзяны млын забяспечваў мукой не толькі жыхароў Новага Свержня, але і суседніх вёсак, такіх як Мархачоўшчына, Кісялеўшчына, Халаімаўшчына, Стары Свержань, Скамарошкі, Караліна, Ператокі, Дразды і нават сам горад Стоўбцы.

Такім чынам, вадзяны млын у в. Новым Свержані меў велізарную ролю – забяспечваў хлебам дадзены рэгіён, што немалаважна.

На сённяшні дзень млын дабудаваны, адноўлены і ў ім размяшчаецца невялікая аграсядзіба – цікавы аб'ект, які ўдала дапаўняе турыстычную інфраструктуру вёскі Новы Свержань.

Былы вадзяны млын – гэта сучасны камфартабельны будынак, тым не менш, не страціў сувязь са сваім гістарычным мінулым, што дае магчымасць гасцям адчуць той дух мінулага, акунуцца ў даўно забытую эпоху. Падарожжа ў часе дапамогуць здзейсніць і некаторыя дэталі, з дапамогай якіх аформлена сядзіба. Гэта дужы, цагляны, на каменнай апоры дом, з невялікімі вокнамі адразу стварае ўражанне чагосьці фундаментальнага, велічнага.

Добраўпарадкоўвана рэчка, на якой стаяў вадзяны млын XIX стагоддзя. Патрачана нямала сродкаў на ачыстку рэчкі, укладку берага каменнем. Пабудавана купель, паглыблена ў гэтым месцы дно, па жаданні турысты могуць акунуцца ў яе і ў летні, і ў зімовы час. Пад час калядных маразоў, на Хрышчэнне ваду асвячае бацюшка, пасля чаго вароты адчыняюць для ўсіх жадаючых.

**Петрапаўлаўскі касцёл з агароджай**
**в. Новы Свержань, вул.Нясвіжская, 21**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад "14"мая 2007г. № 578 "Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей" помнік набыў статус гісторыка- культурнай каштоўнасці катэгорыі "2", унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 612Г000620).

Касцёл – помнік архітэктуры рэнесансу з рудыментамі готыкі (гатычная муроўка сцен). Пабудаваны з цэглы ў сярэдзіне XVI ст.

Будынак аднавежавы, прамавугольны ў плане, з невялікім трансептам і паўкруглай апсідай. Галоўным, паўночным фасадам павернуты на плошчу.

Вежа прабудавана з паўночнага боку асноўнага аб'ёму і мае трох'ярусную кампазіцыю. Вуглы ніжняга яруса ўмацаваны контрфорсамі. Грані верхніх ярусаў апрацаваны плоскімі арачнымі нішамі. У другім ярусе нішы фланкіраваны пілястрамі.

У цэнтральных нішах кожнай грані прарэзаны паўцыркульныя праёмы. Вокны паўцыркульныя.






Вежа накрыта чатырохгранным шатром з кароткім шпілем. Вонкавыя вуглы ніжняга яруса вежы ўмацаваны магутнымі пілонамі, што надае яму канструкцыйную і візуальную ўстойлівасць. Сярэдні ярус вылучаецца тыпова рэнесансным дэкорам у выглядзе трайчастай паўцыркульнай

аркады, рытмічна падзеленай пілястрамі на фоне глухіх сцен. Верхні ярус таксама аздоблены плоскімі паўцыркульнымі арачнымі нішамі.

Інтэр'ер зальнага тыпу. У ніжнім ярусе вежы вылучаны бабінец з размешчанымі над ім хорамі, якія адкрываюцца ў асноўнае памяшканне невялікім арачным праёмам.

Лесвіца на хоры размешчана ў тоўшчы заходняй сцяны. Скляпенні цыліндрычныя з распалубкамі. У бабінцы скляпенне апрацавана дэкаратыўнымі нервюрамі.

Ніжні чацвярык па вышыні роўны з асноўным аб'ёмам і аб'яднаны з ім агульнай цягай карніза; унутры ён падзелены на бабінец і хоры над ім. Матыў паўцыркульнай аркі ў дэкоры і канструкцыі будынка надае яму стылявое адзінства.

Прамавугольны ўчастак касцельнай тэрыторыі акаймаваны мураванай агароджай з 4-слуповай брамай.

**Успенская царква з брамай і агароджай**
**в.Новы Свержань, вул.Нясвіжская, 17**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14”мая 2007г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка- культурнай каштоўнасці катэгорыі “2”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 612Г000619).





Помнік архітэктуры барока. Уяўляе сабой мураваны аднанефны аднавежавы храм з прамавугольнай апсідай і дзвюма прыбудовамі па баках. У кампазіцыі дамінуе высокая чацверыковая вежа, якая нібыта вырастае з вузкага нартэкса, распластанага па шырыні прамавугольнага кафалікона. Галоўны ўваход у царкву зроблены не па восі сіметрыі будынка, а на заходнім фасадзе, з боку плошчы, і акцэнтаваны рэнесансным парталам з ордэрнымі элементамі.

Вежа звонку не падзелена на ярусы і не мае светлавых праёмаў. Яе своеасаблівасць падкрэслівае вельмі выцягнутая па вертыкалі дэкаратыўная плоская ніша з паўцыркульным завяршэннем, размешчаная на паўночным фасадзе. Над бабінцам узвышаецца масіўны чацверык вежы, увенчаны гранёнай глаўкай і аздоблены вертыкальна выцягнутымі паўцыркульнымі нішамі, якія імітуюць вокны. Сцены царквы раздзелены паўцыркульнымі вокнамі.

Успенская царква арыентавана алтаром на поўдзень і павернута да галоўнай плошчы мястэчка бакавым заходнім фасадам.

Зала перакрыта плоскай столлю, пры ўваходзе галерэя хораў на дзвюх драўляных калонах.Адасоблена ад царквы ў бутавую агароджу ўбудавана брама-званіца.

У 1590 г., Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка заснаваў у Новым Свержані праваслаўную Успенскую царкву, магчыма, вымушаны падтрымліваць традыцыі Храптовічаў. Дакументам ад 10 верасня 1592 г. ён вылучыў на гэтую царкву тры валокі зямлі, сенажаць і бясплатны памол на млыне. Акрамя таго, святар мог сыціць 10 медніц мёду, а воск выкарыстоўваць для царквы.

Пачаткам XVI ст. датуецца першае згадванне пра Навасвержанскую праваслаўную царкву. Каля 1590 года на той жа былой рынкавай плошчы быў пабудаваны новы драўляны будынак. Храм быў асвячоны ў гонар Успення Прасвятой Багародзіцы. Праваслаўнай царква паспела пабыць зусім няшмат. Пазней храм перайшоў да уніятаў і пры ім быў створаны базыльянскі манастыр.

У пачатку XVII стагоддзя Успенская царква згарэла падчас аднаго з пажараў у мястэчку, таму для яе было пабудавана новае, ужо каменнае. Будынак, ўпрыгожвае мястэчка і ў нашы дні (дарэчы, па іншай версіі каменны будынак Успенскай царквы быў пабудавана ўжо непасрэдна каля 1590 г.). Сучасны выгляд, меркавана, царква набыла пасля перабудоў XVII стагоддзя.

У 1739 годзе Міхал Радзівіл Рыбанька дамовіўся з літоўскім праконсулам уніяцкага манаскага ордэна базыльянаў Канюшэўскім аб заснаванні пры Навасвержанскай царкве кляштара на 4-х манахаў выкладчыкаў і семінарыі на 12 вучняў. На ўтрыманне кляштара і семінарыі гетман перадаў царкве 3 валокі зямлі, а таксама абяцаў штогод плаціць 5200 злотых. Гэта была першая ўніяцкая семінарыя на землях сучаснай Беларусі.

У 1743 г. Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька вылучыў базыльянам 74 000 злотых, што дало ім магчымасць часткова аднавіць храм. У 1773 годзе пры царкве была адкрыта таксама і трохкласная базыльянская школа. Пасля вайны 1812 г. кляштар быў моцна пашкоджаны і прыйшоў у заняпад. Пасля

скасавання ордэну ў 1833 і пераводу уніятаў у праваслаўе царква пераасвячона ў праваслаўны храм.

У 1860-х гадах у царквы Успення адбылася надзвычайнаяя падзея. Адзін з званоў на вежы-званіце, не вытрымаўшы ускладзенай на яго нагрузкі, зваліўся. Пасля падзення званы знялі і астатнія пакінутыя (усяго было 4 званы масай 10, 5, 3 і 2 пуду) і наладзілі званіцу ў царкоўнай агароджы. Так з'явілася брама-звоніца, якая захавалася да нашага часу (упершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах ў 1878 годзе). Трэба сказаць, што падобнае новаўвядзенне не моцна падабалася праваслаўным новасвержанам. Яны адзначалі, напрыклад, нізкую вышыню брамы-званіцы, з-за якой звон не быў добра чутны нават у суседнім доме святара, у адрозненне ад той жа магутнай касцельнай званіцы. Акрамя таго адзначаўся такі цікаўны факт, што мясцовыя яўрэі з-за даступнасці званіцы прыстасаваліся тэлефанаваць у яе званы набат для абвяшчэння пра сход яўрэйскіх гандляроў на рынкавай плошчы. Таму праваслаўныя жадалі аднавіць уласна царкоўную званіцу, але на гэта патрэбныя былі сродкі. Час жа распарадзіўся інакш. 14 чэрвеня 1890 года ў Новым Свержані адбыўся страшны пажар, падчас якога мястэчка амаль цалкам згарэла. І царква Успення таксама вельмі выдатна выгарэла знутры. На аднаўленне храма згодна з каштарысам патрабавалася 6345 рублёў. Парафіяне з знішчанага агнём мястэчка і небагатых навакольных вёсак змаглі сабраць толькі 1378,5. Астатнія грошы Святы Сінод вылучыў толькі ў 1897 годзе. Падчас рэканструкцыі царкоўная званіца была канчаткова закладзена наглуха, якой мы яе можам бачыць і па гэты дзень.

Да канца 1980-х гадоў царква не дзейнічала, храм быў прыстасаваны пад гаспадарчую пабудову.

Канстытуцыя СССР і БССР ўключала палажэнні аб ахове помнікаў і іншых культурных каштоўнасцей. Ахова гісторыка-культурных каштоўнасцей ажыццяўлялася на падставе закона СССР “Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры” і адпаведнага закона Беларусскай ССР.

У 1987 годзе выдадзены “Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі” – афіцыйны дакумент, які ўключае помнікі, што ўзяты або павінны быць узяты пад дзяржаўную ахову. Царква Ушэсця у в. Новы Свержань пад нумарам 2973 ўключаны ў гэта выданне.

Рашэннем Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны ад 28.02.2002г. №71 царква была ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

**Брукаваны ўчастак тракту “Новы Свержань – Мір”**
**(брукаваная праезджая частка, узбочына, прыдарожныя пасадкі дрэў)**
**1,8 - 3,1 км участка аўтамабільнай дарогі П 00025**
**“Пад’езд да г.Стоўбцы ад а/д Р-2/Е 85 Стаўбцы- Івацэвічы-Кобрын”**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “2” жніўня 2016г. № 607 помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі“3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Г000667).






На выездзе са Стоўбцаў захаваўся унікальны ўчастак брусчатай дарогі працягласцю ў тры з паловай кіламетры. Але не ўвесь ўчастак дарогі занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, а той дзе найбольш захаваны характэрныя гістарычныя традыцыі беларускага дарожнага будаўніцтва.

Брукаваны шлях – дарога, удасканаленая і ўзмоцненая спосабам ускладвання побач палявых камянёў на папярэдне падрыхтаваны пласт з друзу і пяску, неабходны для выраўнавання паверхні і дрэнажу дажджавой вады. Па краях абмежаваны каменнем, якое стварае выразна бачную мяжу брукаванай дарогі.

Падлягае абавязковаму захаванню аўтэнтычнае аблічча старога шляху з мільёнаў камянёў — жывога сведчання вялікай і цяжкай працы нашых продкаў. З двух бакоў ад дарогі знаходзяцца аллейныя пасадкі таполёў, ліп, хвоі, хмызняку.Таполі і ліпы дасягаюць у дыяметры 1,5 м. Іх ўзрост дасягае 200гадоў.

Дадзеная дарога - тыповы прыклад бруку беларускіх зямель, які вылучаецца сваёй даўжынёй і добрай якасцю. Участак дарогі з’яўляецца адным з нямногіх захаваных прыкладаў уладкавання транспартных

камунікацый, шырока распаўсюджаных у пэўны перыяд на Беларусі і ўяўляе гісторыка – культурную  каштоўнасць з пункту гледжання гісторыі развіцця рэгіёна.

Тэрыторыя па якой праходзіць дарога і тэрыторыя размешчанная ў гэтым раёне мае вялікую гісторыка-культурную каштоўнасць, а таксама турыстычную значнасць. Яны связаны і са старажытнай гісторыяй і з іменем вялікага паэта – Якуба Коласа. “Пры шляху шырокім, дзе стаіць камора, я на свет радзіўся пад глухі шум бору, позняю парою, восенню гнілою …” – пісаў Якуб Колас.

**Мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю народнага паэта Беларусі Якуба Коласа: тэрыторыя мемарыяльнай сядзібы “Акінчыцы”, тэрыторыя мемарыяльнай сядзібы “Ласток”, тэрыторыя мемарыяльнай сядзібы “Альбуць”, тэрыторыя мемарыяльнай сядзібы “Смольня”, тэрыторыя ўрочышча Бервянец 1972 год Стаўбцоўскі раён, г.Стоўбцы, вул.Сянкевіча, 18, в.Мікалаеўшчына, 12 км на паўночны усход ад вёскі, г.Стоўбцы, 3км на паўднёвы ўсход ад горада, в. Мікалаеўшчына, 2 км на паўднёвы захад ад вёскі, урочышча Бервянец, побач з ТАК “Высокі бераг”, на правым беразе р.Нёман**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Б000607).



тэрыторыя мемарыяльнай сядзібы “Акінчыцы”



тэрыторыя мемарыяльнай сядзібы «Альбуць»



тэрыторыя мемарыяльнай сядзібы “Ласток”



тэрыторыя мемарыяльнай сядзібы “Смольня”



тэрыторыя ўрочышча Бервянец

Заказнік уключае тэрыторыю, прылеглую да мемарыяльных сядзіб Акінчыцы, Ласток, Альбуць, Смольня, ур. Бервянец.

**Акінчыцы** - месца нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа; у мінулым засценак; потым вёска, з 1977 г. увайшла ў г. Стоўбцы. Тут у 1881-83 гг. Жыла сям'я Міцкевічаў. У адноўленай сядзібе (жылы дом, гумно, склеп, калодзеж) адкрыта для наведвання мемарыяльная экспазіцыя. Сярод экспанатаў аналагі рэчаў, якімі карысталася сям'я Міцкевічаў, прылады працы.

**Альбуць** - былая леснічоўка ў 5 км ад Стоўбцаў. Будучы пісьменнік жыў тут у 1890-1902 гг. Вучыўся ў так званых дырэктараў А. Фурсевіча і Я. Міцкевіча. Апаэтазаваў у паэме "Новая зямля" пад назвай Парэчча. Будынкі адноўлены, у 1961 г. устаноўлена мемарыяльная дошка. Тут створана літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя па матывах паэмы "Новая зямля".

**Ласток** - мемарыяльная сядзіба ў 12 км ад в. Мікалаеўшчына. Тут у 1885-1890 гг. прайшлі дзіцячыя гады Я.Коласа. У двух пакоях размясцілася літаратурная экспазіцыя па матывах паэмы "Сымон-музыка".

**Смольня** - у 1910 г., праз 8 гадоў пасля смерці Міхала, Міцкевічы нарэшце купілі сваю хату ў Смольні на арандаванай зямлі, куды перавезлі будынак з Уздзенскага раёна. Калі будавалася хата, Якуб Колас сядзеў у мінскай турме, і толькі 19 верасня 1911 г. прыехаў сюды ўпершыню. Беднай і запусцелай здалася паэту Смольня. Каб хоць крыху зрабіць яе ўтульнай, Якуб Колас пасадзіў на сядзібе дрэвы – ліпы. Пад гэтымі ліпамі сядзелі маладыя Якуб Колас і Янка Купала ў час першай сустрэчы летам 1912 г. У Смольні Якуб Колас бываў некалькі разоў у 1911 – 1914 г. Тут працягвалася праца над паэмай “"Новая зямля“ і “Сымон-музыка”, напісаны шэраг вершаў, апавяданняў. Апошні раз Якуб Колас наведаў Смольню 30 красавіка 1956 г.

**Бервянец** - знаходзіцца каля вёскі Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёну, побач з ТАК “Высокі бераг”, на правым беразе р.Нёман. Сюды прыходзіў Якуб Колас любавацца прыгажосцю прыроды, і менавіта гэтае месца ён апісваў у сваім вершаваным рамане «Новая зямля». Стала добрай традыцыяй наладжванне і правядзенне фестывалей, і злётаў рэспубліканскага і абласнога ўзроўню ў Бервянцы, для чаго адмыслова была пабудавана сцэна. Таксама гэта вядомае месца адпачынку для жыхароў Стаўбцоўшчыны і размешчанай непадалёку турбазы “Высокі бераг.” На сённяшні дзень Бервянец служыць сцэнічнай пляцоўкай для коласаўскіх свят, турслётаў.

## Брацкая магіла
## г. Стоўбцы, пл. Бессмяротнасці 1944 г.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000605).







На плошчы Бессмяротнасці першапачаткова пахавана 449 чалавек воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні города і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у канцы чэрвеня – пачатку ліпеня 1944 г. Сярод пахаваных – воіны 9-ай гвардзейскай і 30-ай кавалерыйскай дывізіі 4-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса конна-механізаванай групы генерала І.А. Пліева, партызаны брыгады імя Г.К. Жукава.

А ў 1966 г. на магіле пастаўлены помнік (скульптар І.Глебаў: бетон, мармуровая крошка; вышыня пастамента – 2,1 м, скульптур – 3 м).

На плошчы Бессмяротнасціў 22 гадавіну вызвалення Беларусі і Стаўбцоўшчыны прыехалі былыя партызаны, воіны, камсамольцы, калгаснік, прадстаўнікі працоўных калектываў. Помнік збудаваны на сродкі калгасаў, прамысловых прадпрыемстваў раёна.

На пастаменце скульптурнай кампазіцыі напісаны словы: "ЖЕРТВАМ СОВЕТСКОЙ АРМИИ И ПАРТИЗАНАМ ОТ РАБОТАЮЩИХ СТОЛБЦОВСКОГО РАЙОНА”.

Па абодва бакі за скульптурнай кампазіцыяй знаходзяцца дзве мемарыяльныя сцяны. На іх прымацавана 31 мемарыяльная дошка, на якіх нанесены прозвішчы пахаваных воінаў.

На працягу наступных гадоў былі ўшанаваны і зроблены яшчэ перапахаванніабаронцаў Айчыны. У цяперашні час у дадзеным вайсковым пахаванні колькасць пахаваных 534. З іх 497 – вядомых, 37 – невядомых, ваеннаслужачых – 378, удзельнікі супраціву – 156.

Жыхары Стоўбцаў прыходзяць на плошчу Бессмяротнаці, тут, схіліўшы галовы, жывыя аддаюць даніну павагі тым, хто загінуў за вызваленне Радзімы ад фашысцкіх захопнікаў. Наведванне помніка гісторыі спрыяе фарміраванню ў моладзі памяці і памінання, як асноватворных фактараў духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання будучых пакаленняў, адлюстроўвае высакародныя пачуцці цяперашняга пакалення да тых людзей, якія нарадзіліся, жылі на гэтай зямлі, змагаліся за светлую будучыню.

**Магіла А.М.Касценчыка**
**г.Стоўбцы, вул.Калгасная, на могілках**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000606).



Рускі ваенны лётчык А.М.Касценчык нарадзіўся ў 1889г. у г.Гродна. Скончыў Віленскае ваеннае вучылішча. Як лепшы курсант накіраваны ў 1914г. у Гатчынскую авіяцыйную школу. У1-ю сусветную вайну ў 1915г. прызначаны камандзірам экіпажа аднаго з першых рускіх самалётаў “Ілья Мурамец”.

Гэты самалёт узнімаўся на значную для таго часу вышыню, браў важкі груз, пралятаў далёкія адлегласці. Нават яго назва наводзіла жах на ворага. У 1916г. падчас аднаго з паветраных налётаў на чыгуначную станцыю ў тыле ворага самалёт А.М.Касценчыка быў падбіты. Цяжка паранены і кантужаны лётчык знайшоў сілы, каб зрабіць яшчэ адзін круг над станцыяй і скінуць апошнія бомбы. У гэты час новы варожы снарад пашкодзіў матор бамбардзіроўшчыка. Памочнік камандзіра экіпажа з вялікай цяжкасцю дасягнуў самалёт да свайго аэрадрома. Пасля шпіталю па стану здароўя А.М.Касценчык не мог служыць у авіацыі. Жыў у Стоўбцах у брата. Памёр 29.12.1935 г.

У 1916 г. учас аднаго з палёта на чыгуначную станцыю ў тыле ворага самалёт А.М. Касценчыка быў падбіты. Цяжка паранены і кантужаны лётчык зрабіў яшчэ адзін круг над станцыяй і скінуў апошнія бомбы.

У гэты час новы снарад пашкодзіў матор самалёта. Памочнік камандзіра экіпажа з вялікай цяжкасцю дацягнуў самалёт да свайго аэрадрома.

Магіла А.М. Касценчыка знаходзіцца на праваслаўных могілках, па вуліцы Калгаснай у г. Стоўбцы. На магіле ўстаноўлены мармуровы помнік вышынёй каля двух метраў, на прамавугольным падмурку.

На вяршыні помніка ўзвышаецца крыж. На пастаменце маецца ўглыбленне (22х15см), дзе знаходзіцца абраз Збавіцеля Ісуса Храніцеля. Надмагільны помнік пабелены, вакол выкладзена плітка. Тэрыторыя помніка агароджана. Помнік на магіле А.М. Касценчыка, пабудаваны на сродкі брата-святара Апалінарыя.

**Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку І стагоддзе**
**Мінская вобласць, Стаўбцоўскі раён, в. Васілеўшчына, 0,2 км**
**на поўдзень ад вёскі, урочышча Гарадок**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000608).



Гарадзішча размешчана на ўзгорку вышынёй да 3м, мае авальную пляцоўку памерам 72х42 м, выцягнутую з усходу на захад. Абарончыя валы, якія акружалі гарадзішча, зруйнаваны ў пачатку 1970-х гг. Стан здавальняючы. На помніку ўсталявана ахоўная дошка.

Гарадзішча вядома з пачатку ХХ ст. У 1979 г. абследаваў М.М. Чарняўскі, у 1986 г. – А.М. Мядзведзеў, які зрабіў шурф 2х2 м. У культурным пласце выяўлены фрагменты штрыхаванай керамікі, перапаленыя камяні, шлак. Датуецца першымі стагоддзямі н.э., адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі. Яго магутнасць пры невялікай насычанасці матэрыяламі ў цэнтры пляцоўкі дасягае да 65 м. Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

**Стаянка перыяду неаліту 3-е тысячагоддзе да н.э.**
**Мінская вобласць, Стаўбцоўскі раён, в. Кругліца, 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Нёман, у лесе, урочышча Лысая Гара**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000614).





Адным з найбольш даследаваным помнікам нёманскай культуры з’яўляецца ў Панямонні – Лысая гара (М.М.Чарняўскі - 405кв.м). Менавіта археалагічныя матэрыялы з Лысай гары дазволілі вылучыць першы, ранні (лысагорскі) этап нёманскай культуры.

Калі паглыбіцца ў гісторыю, то можна дазнацца, стаянка перыяду неаліту, месцазнаходжанне – Стаўбцоўскі раён, в. Кругліца, 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Нёман, у лесе, урочышча Лысая Гара існавала ўжо ў 3-м тысячагоддзі да н.э. Даўняе размяшчэнне гэтага паселішча тлумачыць цэлым шэрагам абставін: блізкасць Нёмана, які з’яўляецца для старажытнага чалавека адначасова і шляхам перамяшчэння, і адным з месцаў здабычы ежы, і зручнасць размяшчэння – на ўзвышшы, якое ніколі не заліваў Нёман. А людзі, якія тут жылі, можна сказаць, нашы продкі, пакінулі пасля сябе надзвычай цікавую памяць, сапраўдны скарб – рэчы, якія былі ў іх ужытку.

На месцы стаянкі супрацоўнікамі інстытута гісторыі АН БССР у час раскопак было знойдзена больш за 500 прылад працы і фрагментаў керамічнага посуду. Знаходкі са стаянкі паслужылі падставай для вывучэння сярэдняга (лысагорскага) этапу нёманскай культуры. Матэрыялы раскопак знаходзяцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі і Мінскім абласным краязнаўчым музее (г.Маладзечна).

**Курганны могільнік X–XIII стагоддзі**
**Мінская вобласць, Стаўбцоўскі раён, в. Кругліца, 2,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, у лесе, абапал дарогі ў в. Заямнае**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000615).






На правым беразе ракі Нёман, у лесе, з двух бакоў ад дарогі на в.Заямнае знаходзяцца 2 насыпы круглай формы дыяметрам 6 і 7 м, вышыня 1,0 і 0,6 м. У падножжа ракі. На помніку ўсталявана ахоўная дошка. Выявіў у 1951 г. У.С. Астапаў, абследаваў у 1981 г. М.М. Чарняўскі. Па асаблівасцям формы адносіцца да X-XIIIстагоддзі. Праз 0,2 км на усход ад Лысай гары лясная дарога пераразае невялікі пагорак. На дарозе знойдзены крамяневыя пласцінкі і аднапляцовачны нуклеус з шматлікімі заланамі на гранях.

**Курганны могільнік X–XIII стагоддзі**
**Мінская вобласць, Стаўбцоўскі раён, в. Кругліца, 0,4 км на паўночны захад ад вёскі, каля дарогі ў в. Жукаў Барок, у лесе**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3” унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000616)



На правым беразе р.Нёман , у лесе, на плошчы памерамі 150Х50 м., уздоўж дарогі ў в Жукаў Барок размешчаны 7 курганных насыпаў (4- з левага боку, 3 – з правага боку дарогі). 6 насыпаў круглай формы дыяметрам 6 – 9 м, вышынёй 0,4 –1,4 з ровікамі ў падножжа. Адзін курган даўжынёй да 7 м, шырынёй 3м. Курганы каля самой дарогі пашкоджаны прыдарожнымі равамі, два курганы пашкоджаны ямамі.

**Стаянка перыяду каменнага веку 3-е тысячагоддзе да н.э.**
**Мінская вобласць, Стаўбцоўскі раён, в. Мікалаеўшчына, на паўднёвай ускраіне вёскі, на правым беразе р. Нёман**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3” унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000617).






Стаянка была выяўлена ў 1975 г. М. М. Чарняўскім і абследавана ў 1976 г. У тым жа годзе даследчык заклаў на помніку шурф, а ў 1986 г. – паўторна абследаваў тэрыторыю паселішча і сабраў пад’ёмны матэрыял. Знойдзены расшчэпленыя крамяні, кераміка, якая адносіцца да ранняга (дубічайскага) перыяду нёманскай культуры. Знаходкі захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

**Стаянкі перыяду каменнага і бронзавага вякоў**
**3–2-е тысячагоддзі да н.э.**
**Мінская вобласць, Стаўбцоўскі раён, в. Русаковічы, 0,3–1,5 км на захад, на поўнач і на ўсход ад вёскі**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3” унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000622).





**Стаянка - 1** знаходзіцца за 1 км на захад ад вёскі, у левабярэжнай пойме Нёмана, на пясчаным узгорку вышынёй над поймай каля 4 м. Адкрыў і даследаваў у 1975-1976 гг. М.М. Чарняўскі на плошчы 204 кв.м. Культурны пласт 0,4 м. Знойдзены крамяневыя прылады працы і фрагменты керамікі, якія адносяцца да ранняга перыяду нёманскай культуры. Сярод крамянёвых вырабаў – скрабкі на адшчэпах і пласцінах, трохвугольныя наканечнікі стрэл, нажы, вастрыё, сякера камбінаваныя прылады, аднапляцовачныя ядрышчы. Фрагменты рыхлых вастрадонных гаршкоў артаментаваны пераважна грабеньчатымі ўзорамі. На паселішчы трапляюцца знаходкі сярэднебронзавага часу. Датуецца 3-м тысячагоддзем да н.э.

**Стаянка - 2** знаходзіцца за 1,5 км на ўсход ад вёскі, у левабярэжнай пойме р. Нёман, на пясчаным узгорку вышынёй 2 м, ва ўрочышчы "У дубах". Адкрыў і даследаваў у 1975-1976 гг. М.М. Чарняўскі. Ускрыта 120 кв.м плошчы. Культурны пласт 0,6 м. Крамянёвыя прылады – скрабкі і скоблі, разцы, адшчэпы і пласціны з рэтушшу, загатоўкі для сякер выраблялiся з цёмна-шэрага матэрыялу. Неалітычная кераміка падзяляецца на 3 тыпы: абломкі гаршкоў дубічайскага тыпу, кераміка лысагорскага тыпу, арнаментаваная наколкамі канцом палачкі, прагладжанымі лініямі, насечкамі, адбіткамі грэбеня, гаршкі позненеалітычнага (дабраборскага) тыпу з гарызантальнай заштрыхоўкай, арнаментаваныя "семечкавымі" узорамі і адбіткамі кароткага грэбеня. Датуецца 3-м тысячагоддзем да н.э.

**Стаянка-3** знаходзіцца за 1,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, на дзюне правабярэжнай поймы Нёмана. Адкрыў і даследаваў у 1976 г. М.М. Чарняўскі. У паўднёвай частцы закладзены раскоп плошчай 160 кв.м. Культурны пласт 0,6 м. Выяўлена шмат ям, большасць якіх адносіцца да бронзавага веку. Сярод крамянёвых прылад працы скрабкі, пласцінкі з крутой рэтушшу, разцы, трохвугольныя наканечнікі стрэл, лістападобныя наканечнікі дроцікаў, вастрыё яніславіцкага тыпу, рэжучыя і рубячыя прылады, невялікія і кароткія ядрышчы. Неалітычная кераміка нёманскай культуры дубічайскага тыпу падобная да знаходак з паселішча 1. Сярод яе арнаментаў ёсць узоры з грабеньчатых адбіткаў, наколаў канцом нахіленай палачкі, адбіткаў размачаленай палачкі, сеткавыя з тонкіх пракрысленых рысак. Для керамікі лысагорскага тыпу характэрны арнаменты з ямкавых паглыбленняў, наколаў, слядоў тарцоў лапаткі. Кераміка добраборскага тыпу была арнаментавана насечкамі, вузкім лінейным штампам, пракрэсленымі і тэкстыльнымі ўзорамі. Кераміка бронзавага веку арнаментавана пераважна адбіткамі шнура, тарца лапаткі, баразёнкамі. Датуецца 3-2м тысячагоддзямі да н.э.

**Паселішчы перыяду каменнага веку 3-е тысячагоддзе да н.э.
Мінская вобласць, Стаўбцоўскі раён, в. Сверынава, на поўдзень, усход і паўднёвы захад ад вёскі, на правым беразе р. Нёман**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасце” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3” унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000623).

Паселішчы знаходзіцца на поўдзень, усход і паўднёвы захад ад вёскі Сверынава, на правым беразе р.Нёман. Узвышша на поплаве правага берага р.Нёман памерам 105 х 60 м.

Выявіў у 1965 г. і даследаваў у 1975 г. М.М. Чарняўскі. Культурны пласт 0,3-0,6 м. Ускрыта 176 кв. м. плошчы.

Знойдзены агнішча, выкладзенае невялікімі камянямі, крамянёвыя скрабкі, скоблі, скрэблы, разцы, наканечнікі стрэл, нажы. Фрагменты гаршкоў упрыгожаны грабеньчатымі адбіткамі, пагладжанымі і пракрэсленымі лініямі, "капыткамі", трохвугольнымі і ямкавымі наколамі, насечкамі, адбіткамі канцом лапаткі, “семечкамі” і інш. Некаторыя фрагменты маюць раслінныя дамешкі ў гліне. Адносіцца да нёманскай культуры. Датуецца 3-м тысячагоддзем да н.э.



**Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку**
**V стагоддзе да н.э. – V стагоддзе н.э.**
**Мінская вобласць, Стаўбцоўскі раён, в. Сула, 1 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе, на левым беразе р. Сула**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад “14” мая 2007г. №578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” помнік набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3” унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 613Д000624).

Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку размешчана на паўночны захад ад вёскі Сула, на левым беразе р.Сула. Пляцоўка авальная, дыяметрам да 80 м акружана ровам глыбінёй 1-1,5 м і, з усходняга боку слаба прыкметным валам. З усходняга боку маецца роў і месца ўваходу на пляцоўку. Мясцовая назва “Сульскі гарадок”. Помнік без бачных пашкоджванняў. На помніку ўсталявана ахоўная дошка.

Вядома з XIX ст. Абследаваў у 1979 г. М.М. Чарняўскі, у 1986г. – разведка А.М.Мядзведзеў. Знойдзены фрагменты штрыхаванай керамікі. Датуецца першымі стагоддзямі н.э., адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі.

